

# КАНВЕНЦЫЯ МАП 190

## АБ ГВАЛЦЕ І ДАМАГАННЯХ У СВЕЦЕ ПРАЦЫ

## КАМПАНІЯ ПА РАТЫФІКАЦЫІ КАНВЕНЦЫІ МАП №190

## МОЖА ЗМЯНІЦЬ ЛЁСЫ

Як прафсаюзы мы павінны адыграць важную ролю ў тым, каб гэтая Канвенцыя ператварылася з паперы ў рэальнасць.

Разам мы павінны працаваць над тым, каб краіны-члены МАП ратыфікавалі Канвенцыю і зрабілі яе часткай свайго нацыянальнага заканадаўства.

### ШТО МОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ ПРАФСАЮЗЫ:

- Павышаць дасведчанасць і забяспечыць адукацыю сябраў прафсаюза і грамадства ў цэлым.
- Актыўна ладзіць кампанію па ратыфікацыі К190 у кожнай краіне.
- Мабілізавацца вакол праблемы гвалту і дамаганняў у свеце працы.
- Будаваць альянсы з іншымі прафсаюзамі, нацыянальнымі цэнтрамі, НДА і, асабліва, з жаночымі праваабарончымі групамі, каб дапамагчы ліквідаваць гвалт і пераслед на працоўным месцы.
- Заснаваць структуры для адвакацыі і прасоўвання ідэі ратыфікацыі.

**Больш матэрыялаў кампаніі можна знайсці тут:**

**UNI GLOBAL UNION** www.breakingthecircle.org

**PSI** www.publicservices.international/campaigns/stop-gender-based-violence-at-work?id=5676&lang=en

**IUF** www.iuf.org/show.php?lang=en&tid=82

**IDWF** www.idwfed.org/en/campaigns/c190

**INDUSTRIALL** www.industriall-union.org/women-0

**IFJ** www.ifj.org/what/gender-equality.html

**Гвалт і дамаганні ў сферы працы могуць адбывацца дзе заўгодна і калі заўгодна** - у Інтэрнэце, непасрэдна на працоўным месцы, па дарозе на працу і назад, падчас адпачынку, прыёму ежы ці задавальнення санітарна-гігіенічных патрэбаў, а таксама падчас грамадскіх мерапрыемстваў.

### МЫ МОЖАМ ГЭТА СПЫНІЦЬ!!

У чэрвені 2019 года Міжнародная канферэнцыя працы выказалась супраць гвалту і дамаганняў у свеце працы, прыняўшы прынцыповы міжнародны інструмент, Канвенцыю 190 (К190) і Рэкамендацыю 206 (Р206).

Гэтая новая Канвенцыя абараняе ўсіх працоўных, незалежна ад статусу працоўнага кантракта; стажораў, вучняў, людзей, якія навучаюцца, работнікаў, занятасць якіх спынена, валанцёраў і шукаючых працу.

- Яна мае моцны акцэнт на гвалт па прыкмеце полу. Жанчыны непрапарцыйна церпяць ад гвалту і пераследу ў свеце працы.
- Яна ахоплівае дзяржаўны і прыватны сектары, сельскую і гарадскую, фармальную і нефармальную эканоміку.
- Яе сфера дзейнасці - свет працы, які перавышае толькі фактычнае працоўнае месца.
- Канвенцыя ахоплівае ўсіх

### ЧАМУ К190 ВАЖНАЯ?

- Гвалт і дамаганні на працы недапушчальныя.
- Гэта першы міжнародны стандарт, які мае на мэце пакласці канец гвалту і дамаганням у свеце працы.
- Канвенцыя прызнае, што кожны чалавек мае права на свет працы, вольны ад гвалту і дамаганняў.
- Канвенцыя закрывае існуючыя прабелы ў нацыянальным заканадаўстве.

# ЗМЕНА СТАЎЛЕННЯ І САДЗЕЙНІЧАННЕ РОЎНАСЦІ

**Усе мы ў свеце працы - урады, наймальнікі і працоўныя - павінны адыгрываць ролю ў забеспячэнні і падтрымцы культуры працы, заснаванай на ўзаемнай павазе і годнасці.**

- Канвенцыя з'яўляецца важкім інструментам барацьбы з дыскрымінацыяй і няроўнасцю ў свеце працы.
- Канвенцыя абвяшчае, што ўрады павінны прымаць заканадаўства, якое забяспечвае права на роўнасць і адсутнасць дыскрымінацыі ў галіне працы і занятасці для ўсіх, у тым ліку для жанчын, мігрантаў, людзей з абмежаванымі магчымасцямі і множнымі і перасякальнымі ідэнтычнасцямі, няхай гэта будзе раса, этнічная прыналежнасць, статус карэнных народаў, сэксуальная арыентацыя ці гендэрная ідэнтычнасць.
- Ацэнка рызык на працоўным месцы, як прадугледжвае Канвенцыя, таксама можа дапамагчы змяніць стаўленне, паколькі можа ўлічваць фактары, якія павышаюць верагоднасць гвалту і дамаганняў (напрыклад, гендарныя, культурныя і сацыяльныя нормы).
- А таксама К190 упершыню ўключае хатні гвалт як элемент, які ўплывае на занятасць, а таксама на здароўе і бяспеку рабочых.

## ШТО ТАКОЕ ГВАЛТ І ДАМАГАННІ?

- **Гвалт і дамаганні гэта шэраг непрымальных формаў паводзінаў і практык, або пагроз, якія могуць адбыцца адзін або некалькі разоў, з мэтай ці верагоднасцю прывесці да фізічнага, псіхалагічнага, сэксуальнага ці эканамічнага ўрону.**
- **Гвалт і дамаганні з'яўляюцца больш, чым фізічным жорсткім абыходжаннем.**
- **Злачынцамі могуць быць наймальнікі, кіраўнікі, кантралёры, аднагодкі, калегі, а таксама трэція асобы, такія як кліенты, сваякі і сябры наймальніка і пастаўшчыкі паслуг.**
- **Гвалт закранае і мужчын, і жанчын, хаця на жанчын гэты ўплыў непрапарцыйны.**
- **Гвалт называюць гендэрным, калі ён накіраваны на чалавека з-за яго полу ці гендэрнай ідэнтычнасці.**
- **У жыцці Кожная трэцяя жанчына і дзяўчынка, незалежна ад іх эканамічнага стану, перажывае гвалт.**

# КАНВЕНЦЫЯ № 190 І ПРАФСАЮЗЫ - ГЭТА НАШ ІНСТРУМЕНТ, І МЫ ПАВІННЫ ЯГО ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ!

Згодна з Канвенцыяй 190:

- Гендэрныя гвалт і дамаганні, уключаючы бытавы гвалт, павінны стаць пытаннямі аховы здароўя і бяспекі працы.
- Наймальнікі ў кансультацыі з прафсаюзамі абавязаны прымаць меры і распрацоўваць палітыку прадухілення гвалту і дамаганняў на працоўным месцы.
- Канвенцыя абавязвае дзяржавы прадастаўляць прафсаюзам рэсурсы і навучанне па пытаннях гвалту і дамаганняў у свеце працы, у тым ліку гвалту па прыкмеце полу.

К190 уступіць у сілу праз 12 месяцаў пасля ратыфікацыі дзвюма дзяржавамі-членамі МАП. Але прафсаюзам не трэба чакаць ратыфікацыі; мы павінны ўжо сёння выкарыстоўваць гэты інструмент, каб змяніць жыццё працоўных.

**КАНВЕНЦЫЯ МАП 190**

**Канвенцыя № 190 надае імпульс прафсаюзам і іншым зацікаўленым бакам ў барацьбе з гвалтам і дамаганнямі ў сферы працы.**

## ДАВАЙЦЕ ЁЙ КАРЫСТАЦЦА!

- Садзейнічаць недыскрымінацыі і роўнасці праз кампаніі і калектыўныя перамовы.
- Вучыць сябраў прафсаюза пра тое, што такое гвалт і дамаганні ў свеце працы.
- Павышаць дасведчанасць сярод сябраў прафсаюза аб К190 і яе значэнні. К190 - гэта канвенцыя, якая мяняе жыццё, якая дапаможа мільёнам работнікаў займець больш бяспечную працоўную абстаноўку, дапамагаючы ліквідаваць усе формы гвалту і дамаганняў, асабліва гендэрны гвалт.
- Дадаць паняцці, узятыя з канвенцыі, ў калектыўныя дамовы.
- Працаваць з наймальнікамі, каб пераканацца, што палітыка аховы здароўя ўключае выкараненне гвалту і дамаганняў, а дакладней гендэрнага гвалту.
- Падтрымліваць працу сусветных федэрацый прафсаюзаў у перамовах аб глабальных рамачных пагадненнях, каб уключыць у іх паняцці, узятыя з канвенцыі (К190 / Р206), для барацьбы з гвалтам і дамаганнямі ў свеце працы.